А. І. МАЛЮГІН

# З'ЯЎЛЕННЕ ХРЫСЦІЯНСТВА Ў БРЫТАНІІ

Брытанія была адной з найбольш аддаленых і найменш раманізаваных правінцый Рымскай імперыі. На пачатку ранняга сярэдневечча тут засталося менш за ўсё слядоў рымскай цывілізацыі, у тым ліку і старажытнага хрысціянства. У значнай ступені гэтаму спрыяла і заваяванне Брытаніі язычнікамі-англасаксамі ў V ст.

Тым не менш хрысціянства з'явілася на Брытанскіх астравах даволі рана. Упэўненасць у гэтым даюць, па-першае, археалагічныя даныя, па-другое — засведчанні старажытных хрысціянскіх аўтараў.

Калі звярнуцца да першай групы першакрыніц, то можна зрабіць выснову, што да гэтага часу ў Брытаніі не знойдзена ніякіх археалагічных сведчанняў аб існаванні хрысціянства раней IV ст. н. э. [1] — часу яго ператварэння ў афіцыйную рэлігію Рымскай імперыі. Тады ў Брытаніі з'яўляюцца будовы хрысціянскіх цэркваў (найбольш ранняя з іх адносіцца да 360 г.), нешматлікія хрысціянскія пахаванні, хрысціянскія сімвалы на посудзе і ўпрыгожаннях [2]. Усё гэта разам узятае дало археолагам падставу дапусціць, што колькасць хрысціян у рымскай Брытаніі, нягледзячы на распаўсюджванне веравучэння, заставалася невялікай [3].

Такім чынам, калі зыходзіць толькі з археалагічных даных, то распаўсюджванне хрысціянства ў Брытаніі трэба аднесці не раней, чым да пачатку IV ст. н. э. Калі ж звярнуцца да пісьмовых сведчанняў хрысціянскіх аўтараў, то карціна атрымліваецца зусім іншай. Хрысціянскія легенды гавораць аб тым, што Брытанія была хрысціянізавана яшчэ апосталамі. Аб дзейнасці апосталаў у Брытаніі паведамляе Яўсевій (Evangelical Demonstrations, 3,5); шматлікія легенды сярэдневечча, апісваючы хрысціянізацыю Брытаніі ў I ст. н. э., прыпісваюць яе то апосталу Паўлу, то Іосіфу Арымафейскаму [4]. Усе гэтыя звесткі таксама, як і заява Гільдаса аб тым, што хрысціянства з'явілася ў Брытаніі яшчэ ў перыяд праўлення Тыберыя (памёр у 37 г. н. э.), неpraўдападобны [5].

Іншыя крыніцы змяшчаюць звесткі аб з'яўленні хрысціянства на Брытанскіх астравах у II ст. н. э. Так, аўтар «Liber Pontificalis» («Кніга пантыфікаў») гаворыць аб тым, што рымскі папа Элеўтэрый атрымаў ад брытанскага караля Луцыя пісьмо, у якім той выказаў жаданне стаць хрысціянінам [6]. У далейшым гэта кароткае паведамленне выкарыстаў Беда Паважаны ў сваёй «Царкоўнай гісторыі народа англаў» (I, V). Праўда, ні ў «Liber Pontificalis», ні ў Беды не гаворыцца, адрэагаваў ці не на гэта пасланне папа Элеўтэрый. Аднак ужо ў іншых хроніках, прысвечаных гісторыі Брытаніі, з усімі падрабязнасцямі (яўна надуманымі) расказвалася аб поспеху адпраўленай папам Элеўтэрыем місіі [7]. Калі б гэта пасведчанне «Liber Pontificalis» адпавядала праўдзе, то яно сведчыла б аб з'яўленні хрысціянства ў Брытаніі яшчэ ў другой палове II ст. н. э., а дакладней, паміж 175 і 189 гг. — часам пантыфікату Элеўтэрыя. Між іншым яшчэ ў XIX ст. інфармацыя «Liber Pontificalis» лічылася недакладнай [8].

Але калі інфармацыя «Liber Pontificalis», складзенай не раней VI ст., не можа заслугоўваць даверу, то сведчанне Тэртуліяна аб хрысціянстве ў Брытаніі, здавалася б, павінна прымацца з большым даверам, бо ён пісаў аб сучасных яму падзеях. У сваім творы «Супраць Іудзеяў» Тэртуліян адзначае: «...недасягальныя для рымлян месцы Брытаніі, але падпарадкаваныя Хрысту» (Adv. Iud. VII). Большасць гісторыкаў хрысціянства лічыць гэтае сведчанне Тэртуліяна праўдзівым [9]. Аднак яшчэ У. У. Болатаў заўважыў, што сведчанне Тэртуліяна «падазрона ўжо таму, што ён гаворыць з прамоўніцкім пафасам, які прымушае ўсумніцца ў гістарычнасці сведчання...» [10] Сапраўды, варта прывесці ўвесь абзац, у якім Тэртуліян гаворыць аб хрысціянстве ў Брытаніі, каб зразумець абгрунтаванасць гэтага меркавання: «Ды ў каго ж, як не ў Хрыста, уверавалі ўсе народы?.. парфяне, мідзяне, эламіты, жыхары Месапатаміі, Арменіі, Фрыгіі, Кападокіі, Понта і Асіі, Памфіліі, Егіпта і частак Афрыкі, якія знаходзяцца за Карыніяй, і жыхары Рыма, і іерусалімскія іудзеі, і іншыя народы, і розныя насельнікі Гетуліі, шматлікія жыхары Маўрытаніі, усе рубяжы Гішпаніі, розныя народы Галіі і недасягальныя для рымлян месцы Брытаніі, але падпарадкаваныя Хрысту, а роўным чынам — сарматы, дакі, германцы, скіфы і многія аддаленыя народнасці, і шмат астравоў і правінцый, якія невядомы нам, але якія мы не можам і пералічыць» (Adv. Iud. VII).

Н. І. Галубцова лічыць, што ўвесь гэты ўрывак з'яўляецца не больш, чым прыкладам хрысціянскай прапаганды. Яна падкрэслівае, што Тэртуліян спасылаецца не на сучасныя яму даныя, а на «Дзеянні апостальскія», адкуль ён

атрымлівае назвы народнасцей, дадаючы ад сябе толькі Арменію і Афрыку [11].

Але прызнаючы, што Тэртуліян гаворыць аб хрысціянстве ў тых народаў, якія і не чулі аб яго існаванні, можна лічыць вельмі магчымым, што Тэртуліян мог чуць нешта аб асобных хрысціянах ў Брытаніі, магчыма, як лічыць І. Мірошкін, дзякуючы карфагенскім купцам, якія падтрымлівалі гандлёвыя сувязі з Брытаніяй [12].

Яшчэ больш магчыма, што хрысціянамі былі не брытты, а ўсходнія, у тым ліку і карфагенскія купцы, якія занеслі ў Брытанію хрысціянства, таксама, як і культы Астарты, Кібелы, Ізіды і Асірыса, сляды шанавання якіх у Брытаніі вельмі нешматлікія [13]. Акрамя Тэртуліяна, аб прысутнасці хрысціян у Брытаніі сведчаць Арыген, Еўсевій Кесарыйскі, Гіеронім і іншыя царкоўныя аўтары. Але гэтыя адрывачныя і вельмі часта таксама даволі спрэчныя звесткі не дадаюць нічога істотнага да сведчання Тэртуліяна.

Такім чынам, можна зрабіць вывад, што пісьмовыя сведчанні і археалагічныя даныя па-рознаму вызначаюць час з'яўлення хрысціянства ў Брытаніі. І ўсё ж, першыя хрысціяне, відаць, сапраўды з'яўляюцца ў Брытаніі яшчэ ў II ст. н. э. ці ў пачатку III. Але іх колькасць з'яўлялася вельмі невялікай і яны не пакінулі пасля сябе ніякіх слядоў, за выключэннем скупых звестак у хрысціянскай літаратуры. Сцвярджэнні аб шырокім распаўсюджванні хрысціянства, якое супадае па часу з яго прызнаннем у якасці афіцыйнай рэлігіі Рымскай імперыі, пацвердзілі вынікі археалагічных даследаванняў і больш дакладныя звесткі аб хрысціянстве ў Брытаніі. Так, менавіта да пачатку IV ст. н. э. у крыніцах з'яўляецца імя першага вядомага хрысціяніна ў Брытаніі. Беда ў сваёй «Царкоўнай гісторыі» падрабязна гаворыць аб пакутніку Албане з Веруламія, смерць якога па традыцыі адносіцца да часу праўлення Дыяклетыяна (285 — 305 гг. — Hist. eccl. I, VII). Але не ўсе даследчыкі лічаць Албана асобай гістарычнай, аргументуючы гэта ў асноўным тым, што ў перыяд праўлення Канстанцыя Хлора ў Галіі, Гішпаніі і Брытаніі не было ганенняў на хрысціян, як у іншых частках імперыі [14]. І калі адны з гэтых даследчыкаў наогул адмаўляюць гістарычнасць Албана, то іншыя прыстасоўваюць яго пакутніцтва да больш ранняга ганення, напрыклад да ганення Дэцыя, ці да 286 г. н. э. [15] Але якой бы ні была дата пакутніцкай смерці св. Албана, сам факт яго існавання наўрад ці можна ставіць пад сумненне, бо св. Албан шанаваўся ў Англіі з вельмі ранняга часу і культ яго склаўся не пазней V ст. н. э. [16]

Таксама да пачатку IV ст. адносіцца і зафіксаванае дакументальна афармленне царкоўнай іерархіі на Брытанскіх астравах. Так, дакументы царкоўных сабораў і творы хрысціянскіх аўтараў гавораць аб прысутнасці брытанскіх епіскапаў на царкоўных саборах у Арлі (314 г.), Нікеі (325 г.), Сардзіке (343 г.) і Рыміне (349 г.). Напрыклад, на саборы ў Арлі прысутнічалі брытанскія епіскапы: «(24) Eborius episcopus de civitate Eboracensi pr(ovincia) Britannia. (25) Restitutus episcopus de civitate Londionensi pr. suprascripta. (26) Adelfius episcopus de civitate Coloniae Londinensium» [17].

Акрамя епіскапаў, у брытанскай царкве служылі таксама і духоўныя асобы меншых рангаў — святары і дыяканы. Усё гэта дапамагае атрымаць уяўленне аб іерархічнай структуры брытанскай царквы, яе сувязях з хрысціянскімі цэрквамі іншых частак імперыі, аб павелічэнні колькасці веруючых і пачатку будаўніцтва хрысціянскіх храмаў у Брытаніі. Але такое становішча складваецца толькі з IV ст. і азначае сабой пераход ад першых паасобных хрысціянскіх абшчын да адзінай царквы.

[1] R i c h m o n d I. A. Roman Britain. Harmondsworth, 1978. P. 212.

[2] R i c h m o n d I. A. Op. cit. P. 199; B r i g g s A. Social History of England. Harmondsworth, 1987. P. 29; A i r n e C. W. The Story of prehistoric and Roman Britain. Manchester, s. d. P. 60.

[3] B r i g g s A. Op. cit. P. 29.

[4] Гл.: Т р а й л ь Г. Д. Общественная жизнь Англии. Т. 1. М., 1896. С. 69—70.

[5] M c Neill J. T. The Celtic Churches. Chicago-L., 1974. P. 16.

[6] The Book of the Popes (Liber Pontificalis). New York, 1916. V. 1. P. 17.

[7] Г а л ь ф р и д М о н м у т с к и й. История бриттов. М., 1984. С. 48-49.

[8] Гл., напр.: The Catholic Encyclopedia. New York, 1909. V. 5. P. 379.

[9] Ф у н к Ф. К. История христианской церкви от времен апостольских до наших дней. М., 1911. С. 31; М и р о ш к и н Н. Древняя британская церковь // ЖМНП. 1872. Т. 163. С. 270; П о с н о в М. Э. История христианской церкви. Киев, 1991. С. 77.

[10] Б о л о т о в В. В. Лекции по истории древней церкви. Спб., 1910. С. 297.

[11] Г о л у б ц о в а Н. И. У истоков христианской церкви. М., 1967. С. 85.

[12] М и р о ш к и н Н. Указ. соч. С. 270.

[13] Гл.: R i c h m o n d I. A. Op. cit. P. 202 і наст.

[14] M c N e i l l J. T. Op. cit. P. 19.

[15] Православная богословская энциклопедия. Т. 9. Спб., 1909. Стб. 399.

[16] The Catholic Encyclopedia. New York, 1907. V. 1. P. 253.

[17] Цит. по: Б о л о т о в В. В. Указ соч. С. 299.